**Дубовік, С.** Цяжкімі дарогамі вайны / С. Дубовік // Міёрскія навіны. — 2006. — 8 крас. — С. 2.

## ЦЯЖКІМІ ДАРОГАМІ ВАЙНЫ

У Новапагосцкай сярэдняй школе-садзе адбылася сустрэча з былым выпускніком Станіславам Ставіцкім. Яе арганізавалі дзесяцікласнікі і настаўнікі Наталля Фадзееўна Рыкун, Леаніда Францаўна Закрэўская і Валянціна Гардзееўна Казак.

Станіслаў Іосіфавіч Ставіцкі нарадзіўся ў Новым Пагосце, тут пачаў вучобу ў школе. Яго першай настаўніцай стала Тамара Андрэеўна Невядомская, якая запомнілася на ўсё жыццё, як і класны кіраўнік Яўген Рыгоравіч Хадакоўскі. Станіслаў добра вучыўся, а яшчэ захапляўся музыкай і тэхнікай. У школьным ансамблі ён іграў на гітары і спяваў. А дома дапамагаў бацьку рабіць аэрасані, рамантаваць розную тэхніку, рана навучыўся вадзіць аўтамашыну. І вельмі марыў стаць вадзіцелем. Гэтае дзіцячае жаданне стала рэальнасцю ў час заняткаў у вучэбна-вытворчым камбінаце. Калі закончыў школу ў 1980 годзе, працаваў слесарам у калгасе «Рассвет». Сесці за руль ён яшчэ не мог, бо не дазваляў узрост. Яго працоўнаму станаўленню дапамагалі бацька і новыя сябры.

29 сакавіка 1981 года С. І. Ставіцкі быў прызваны ў Савецкую Армію. Разам з іншымі юнакамі-беларусамі ён трапіў у Сярэднюю Азію, служыў у Тэрмезе ў складзе спецыяльнага падраздзялення. Праз некалькі месяцаў узмоцненай падрыхтоўкі накіраваны ў афганскі горад Айбак на поўначы краіны. Напачатку было вельмі цікава знаёміцца з новай службай і новымі ўмовамі. І адразу давялося прывыкаць да недалёкіх стрэлаў і свісту куль над галавой.

Станіслаў Ставіцкі на аўтамашыне «Урал» развозіў ваду па палках, якія размяшчаліся за 30 кіламетраў. Пры тэмпературы да 60 градусаў цяпла ў цяні гэта быў вялікі дэфіцыт. Ноччу ж было вельмі холадна. А байцам даводзілася жыць у палатках, зямлянках, нават машынах.

Служба Станіславу запомнілася моцнай армейскай дружбай, узаемападтрымкай і ўзаемавыручкай, удзелам у васьмі буйных баявых аперацыях, адпачынкам у час дэманстрацыі кінафільмаў. Назад вяртаўся на верталёце. А 23 мая 1983 года дома яго сустракалі родныя. Вельмі радавалася маці, што яе сын вярнуўся жывы і здаровы.

Цяпер Станіслаў Ставіцкі жыве з сям'ёй у Браславе, працуе шафёрам у дарожнай арганізацыі, з'яўляецца намеснікам кіраўніка раённага аб'яднання воінаў-афганцаў. Аб сённяшнім і мінулым жыцці воіна-афца расказвалі яго фотаальбомы і касета.

Вучні школы спявалі для ветэрана песні, расказвалі вершы, а ў адказ Станіслаў Іосіфавіч спяяў нам пад гітару. У заключэнне ён пажадаў хлопцам больш займацца фізкультурай, якая ім вельмі спатрэбіцца ў час службы ў арміі.

**С. Дубовік**